УДК 39-053.2

# Сацыялізацыя хлопчыка ў традыцыйным грамадстве беларускіх сялян (другая палова XIX – першая палова XX ст.)

Якубінская А. Дз.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Сацыялізацыя дзяцей пачынаецца з моманту нараджэння і ажыццяўляецца пры дапамозе традыцыйных спосабаў і сродкаў, якія робяць чалавека часткай свайго грамадства; яны залежаць ад традыцыйных узораў паводзін і светапогляду, ажыццяўляюць перадачу новаму члену супольнасці традыцыйных культурных каштоўнасцей, садзейнічаюць набыццю адпаведных сацыяльных роляў. Асноўнай мэтай сацыялізацыі дзяцей ва ўзросце ад нараджэння да 6 – 8 гадоў было фарміраванне паўнавартаснага члена сялянскай супольнасці шляхам далучэння да здаровага ладу жыцця. Таму асноўнымі спосабамі і сродкамі сацыялізацыі ў гэтым узросце з'яўляліся агульныя для хлопчыкаў і дзяўчынак традыцыйныя спосабы і сродкі забеспячэння іх здароўя: культура харчавання, спецыяльная вопратка немаўлят, народная педыятрыя. Асноўнай мэтай працэсу сацыялізацыі хлопчыкаў ва ўзросце ад 6 – 8 да 12 – 14 гадоў было фарміраванне ў іх мужчынскай адаптацыйнай стратэгіі, якая павінна была забяспечваць набыццё адпаведнай сацыяльнай ролі. У гэтым перыядзе асаблівую ролю адыгрываў памежны ўзрост 6 – 8 гадоў, калі адбывалася фіксацыя палавой прыналежнасці хлопчыкаў, што выражалася ў іх назве ("блазн", "блазнішка") і адзначалася абрадам першага апранання штаноў. З умацаваннем палавой дыферэнцыяцыі паводзінаў звязаны выбар напрамкаў далейшай дзейнасці хлопчыка, што пацвярджаецца існаваннем "школы пастухоўства" – культурнага феномена, накіраванага на фарміраванне ў хлопчыкаў мужчынскай свядомасці і адпаведных паводзін, актыўнай сацыяльнай ролі. У 6 год хлопчык пачынаў атрымоўваць навыкі пастухоўскай справы, у 10 – 12 ён меў першую "прафесію" пастуха, за якую атрымліваў плату, што павялічвала яго значнасць ў сям'і і спрыяла яго паступоваму вызваленню з-пад матчынага ўплыву. Важнай рысай "школы пастухоўства" з'яўляецца існаванне ў хлапечай суполцы імітацыйных гульняў і гульняў спартыўна-спаборніцкага характару, актыўнае выкарыстанне хлопчыкамі дражнілак, у якіх прасочваецца супрацьпастаўленне хлопчыкаў і дзяўчынак, прыгавораў і небыліц. Такім чынам, своеасаблівыя стэрэатыпы паводзінаў хлопчыкаў залежалі ад іх сацыяльнага вопыту, які набываўся ў працэсе ўключэння іх у грамадства пры дапамозе традыцыйных спосабаў і сродкаў забеспячэння.